*УДК 37.091.33:811.161.3’42:821.161.3-3*
***А. М. Воінава, З. У. Шведава***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ НАВУЧЭНЦАЎ ПРЫ НАПІСАННІ ВОДГУКА Ў МЕЖАХ АЛІМПІЯДНАГА РУХУ

Правядзенне алімпіяд па розных прадметах – гэта рэальны спосаб праверыць веды навучэнцаў, выявіць іх інтэлектуальны патэнцыял, даць шанец раскрыць творчыя здольнасці, павысіць матывацыю да вывучэння асобнай дысцыпліны і нават абудзіць цікавасць да навуковай дзейнасці. Удзел у алімпіядзе развівае здлольнасці навучэнцаў у некалькіх накірунках:

– паглыбленне ведаў: заданні патрабуюць ведаў звыш школьнай праграмы, садзейнічаючы развіццю маўленчай, моўнай і сацыякультурнай кампетэнцый;

– развіццё мыслення: алімпіяды трэніруюць гнуткасць розуму, крэатыўнасць і здольнасць да самастойнага рашэння складаных моўных задач;

– прафесійная арыентацыя: удзел дапамагае вучням вызначыцца з інтарэсамі, павышае матывацыю да вывучэння мовы і прафесійнай камунікацыі;

– падрыхтоўка да рэальных зносін: заданні часта ўключаюць працу з аўтэнтычнымі тэкстамі і заданні на спантанную вусную камунікацыю.

Алімпіяды па беларускай мове адыгрываюць ключавую ролю ў лінгвістычнай падрыхтоўцы, стымулюючы паглыбленае вывучэнне прадметаў, развіццё нестандартнага мыслення, моўнага адчування і функцыянальнай камунікатыўнай кампетэнцыі. Яны выяўляюць таленавітых навучэнцаў, пашыраюць кругагляд і фарміруюць прафесійныя кампетэнцыі, неабходныя ў сучасным моўным асяроддзі.

Адным з заданняў на алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры з’яўляецца напісанне водгука на прапанаваны літаратурны тэкст. Водгук уяўляе сабой разгорнутае меркаванне з уласнай ацэнкай прачытанага, у які ўключаюцца асабістыя ўражанні, суб’ектыўная ацэнка ўчынкаў розных герояў, адлюстраваных падзей, а таксама элементы лінгвістычнага, літаратуразнаўчага, культуралагічнага аналізу мастацкага твора, дэталі абгрунтаванага пераказу напружанай часткі і інш.

Неабходна адзначыць, што водгук на літаратурны твор ёсць тыповае сачыненне-разважанне з адпаведнай яму кампазіцыяй: 1) тэзіс – агульная ацэнка твора; 2) доказы (або аргументы) – меркаванні пра літаратурныя і лінгвістычныя вартасці твора; 3) вывад – думкі пра тое, чым узбагаціў твор аўтара водгуку, чаму яго варта пачытаць іншым.

Нельга не пагадзіцца з тым, што водгук на мастацкі твор складаны і адказны конкурс алімпіяды па беларускай мове і літаратуры. Ён з’яўляецца відам працы творчага характару. Вучань пры мастацкім асэнсаванні літаратурнага твора павінен прадэманстраваць узровень літаратурнага развіцця, чытацкую культуру, сфарміраванасць уменняў аналізу. Для яго напісання не існуе абавязковых схем і гатовых шаблонаў, што стварае пэўныя цяжкасці для канкурсантаў. У чым яны заключаюцца? Не ўсе вучні могуць правільна вызначыць тэму, праблемы і ідэю твора, бо не зусім разумеюць яго змест. Па гэтай прычыне знаходзяць галоўнае ў другарадным, або не бачаць усіх праблем, узнятых аўтарам, а выбіраюць адну і на ёй будуюць свае разважанні. Здараецца, што пераўтвараюць водгук у лінгвістычны аналіз тэксту з пералікам усіх наяўных сродкаў выразнасці, і нават тых, якіх у мастацкім творы няма.

Так, для напісання водгуку для вучняў 9 класа быў прапанаваны верш Я. Сіпакова “Ваўчыца ў звярынцы”, які адносіцца да філасофскай лірыкі, раскрывае тэмы свабоды, а таксама любові маці да дзяцей. Ідэя твора – свабода – з’яўляецца адной з важных умоў паўнавартаснага, шчаслівага жыцця, прычым што для жывёлаў, што для чалавека. Асноўная праблема – праблема свабоды, туга вольнай жывой істоты па звыкламу асяроддзю, па родных ваўчанятах, роспач і бездапожнасць жывой істоты, царыцы лясоў, перад злой воляй чалавека.

У асноўнай сваёй большасці выкананыя водгукі былі даволі пісьменнымі, мелі розны аб'ём і выкарыстаныя тыя ці іншыя творчыя элементы. Сярод недахопаў найперш варта вылучыць наяўнасць загадзя вывучаных частак, куды потым проста ўстаўляўся твор і постаць Я. Сіпакова, прычым найчасцей гэтыя завучаныя часткі былі празмерна эмацыянальныя і стылістычна не адпавядалі астатняму тэксту (напрыклад: *Я. Сіпакова ведаюць амаль ва ўсім свеце. Ён з'яўляецца адным з самых таленавітых беларускіх пісьменнікаў. Верш "Ваўчыца ў звярынцы" – геніяльны твор, я раю прачытаць яго ўсім сваім сябрам* і інш.). Другая распаўсюджаная хіба – пералік сродкаў мастацкай выразнасці без указання іх ролі і значэння ў тэксце. Іншы раз спроба тлумачэння была, але зводзілася да агульных ці банальных высноў: *"Рыфмоўка робіць паэтычны радок лірычнага героя асабліва напеўным", "Сродкі мастацкай выразнасці ствараюць дадатковую вобразнасць, робяць мову вобразнай", "Гэтыя прадметы выступаюць у ролі сімвалаў гэтага верша", "Эпітэты адлюстроўваюць стан лірычнага героя, яго пачуцці", "Метафара надае радкам пераноснае значэнне"* і пад. Пашыранай з'яўляецца спроба замест аналізу твора рабіць яго апісанне, прычым часта недарэчнае: *"У тэксце ёсць назоўнікі і прыметнікі", "Сказы як простыя, так і складаныя", "У тэксце ёсць аднасастаўныя сказы"*. Некаторыя не разумеюць адрозненняў паміж відамі лірыкі, іншы раз нават пішуць, што верш адносіцца і да пейзажнай, і да грамадзянскай лірыкі (хаця гэта ўвогуле лірыка філасофская). Не ўсе выразна фармулююць тэму і ідэю, блытаюць гэтыя паняцці.

Варта таксама памятаць, што гукапіс маецца не ў любым творы! У прыватнасці, гук [а] з'яўляецца самым пашыраным у беларускай мове і прысутнічае ва ўсіх тэкстах.

З маўленчых памылак згадаем русізмы (*тотчас, ланцуг пітання* (цепь питания)), украінізм *будзь-які*, таўталогію *"падарыла падарунак"*, беднасць слоўніка, няправільнае ўжыванне займеннікаў (*ваўчыха высунула лапы праз краты, каб яны былі на свабодзе* – атрымалася, што на свабодзе будуць краты).

Граматычныя і арфаграфічныя памылкі: *алітэрацыя, у чатырох сцянах філасоўскі* і інш. Сярод пунктуацыйных памылак найбольш частымі з'яўляюцца лішнія коскі ў сказах. Таксама распаўсюджана няправільнае афармленне цытат. У прыватнасці, калі цытуецца паэтычны тэкст і падаецца страфа ў сярэдзіне старонкі, то двукоссе не пішацца.

У пачатку некалькіх водгукаў быў эпіграф, але ў саміх работах потым спасылак на яго і тлумачэнне не было. Пры правядзенні паралеляў з творамі іншых аўтараў чамусьці шмат хто прыводзіў менавіта творы В. Быкава. Часта таксама вучні блыталі аўтараў прыведзеных твораў, няправільна ўказвалі назвы тэкстаў.

Адпаведна, удзельнікам трэба пазбягаць штучных завучаных уставак, неабходна сачыць за стылістычнай правільнасцю тэксту, абавязкова ўказваць мэту выкарыстання таго ці іншага тропа, пазбягаць лішняй навуковай тэрміналогіі і пераўтварэння водгуку ў лінгвістычны аналіз тэксту з пералікам усіх наяўных сродкаў выразнасці, а таксама варта памятаць пра належнае афармленне цытат.

Для водгука вучням 10 класа быў дадзены філасофскі твор Змітрака Бядулі "Ратай" , які закранае тэму сэнсу і мэты чалавечага жыцця, прызначэння чалавека. Гэта абразок – твор малой празаічнай формы. Сярод вобразна-выяўленчых сродкаў у творы прысутнічаюць эпітэты, метафары, адухаўленні, полісіндэтон.

Амаль усе ўдзельнікі алімпіяды правільна вызначылі асноўную тэму і ідэю гэтага твора. Пры напісанні водгука большая частка ўдзельнікаў звярталася да твораў іншых аўтараў, многія вучні выкарыстоўвалі цытаты. Некаторыя звярталіся да біяграфіі аўтара. Прысутнічаюць работы з цікавымі назіраннямі над творам, якія сведчаць аб пэўным чытацкім вопыце вучняў, уменні абгрунтоўваць свае вывады. У большасці ж сустракаем канстатацыю арыгінальнасці прачытанага або цікавыя назіранні, але без пэўных доказаў.

З вызначэннем кампазіцыі твора і вобразных сродкаў вучні ў цэлым справіліся, але многія не змаглі паказаць іх ролю ў раскрыцці тэмы і ідэі твора. Многія вучні пералічвалі сродкі мастацкай выразнасці, але не растлумачылі іх ролю ў тэксце.

Кампазіцыя водгуку ў некаторых прадуманая, што сведчыць аб уменні пісаць такога роду работы, але прысутнічаюць  недахопы: частае выкарыстанне русізмаў ("*прыказ*" замест "загад", "*кем-небудзь*" замест "кім-небудзь", "*да*" замест "ды");  неразуменне сэнсу слова (*марнаваць* замест *марыць*), недарэчнае выкарыстанне слоў (*навакольныя людзі*), блытанне іх сэнсу (*вынікі* і *высновы, зваротак* замест *зварот*) і інш.; сярод пунктуацыйных памылак найбольш частымі з'яўляюцца лішнія коскі ў сказах. Таксама сутракалася няправільнае афармленне цытат (адсутнасць двукосся ці двукроп'я); граматычныя і арфаграфічныя памылкі: *частке, даследванні, ні* замест *не*.

У 11 класе водгук было трэба напісаць на верш Янкі Сіпакова "Асенняе раўнадзенства", які з'яўляецца выразным прыкладам філасофскай лірыкі. Тэма –яднанне чалавека і прыроды, ідэя –  чалавек сам творыць сваё шчасце, усё залежыць не ад абставін, а ад нашых адносін да гэтых абставін.

Большасць удзельнікаў алімпіяды правільна вызначылі асноўную тэму і ідэю гэтага твора, падкрэсліваючы, што ўсе праблемы ў чалавека ў галаве. Пры напісанні водгуку далёка не ўсе ўдзельнікі выкарыстоўвалі цытаты і паралелі з іншымі творамі.

Прысутнічаюць работы з цікавымі назіраннямі над творам, што сведчыць аб пэўным чытацкім вопыце вучняў, уменні абгрунтоўваць свае вывады. У большасці ж сустракаем канстатацыю арыгінальнасці прачытанага або цікавыя назіранні, але без пэўных доказаў. З вызначэннем кампазіцыі твора і вобразных сродкаў вучні ў цэлым справіліся, але далёка не ўсе змаглі паказаць іх ролю ў раскрыцці тэмы і ідэі твора.

Кампазіцыя водгуку ў некаторых прадуманая, што сведчыць аб уменні пісаць такога роду работы, але шматлікія недахопы моўнага выражэння (рускае слова 'закат' перакладаюць як 'захад' (замест правільнага 'заход') і нават ставяць яго ў множны лік – 'захады'; няправільнае выкарыстанне канчаткаў дзеясловаў (*плачым*, а трэба *плачам*), што сведчыць пра недастатковае валоданне катэгорыяй спражэння дзеяслова; памылкі ў выкарыстанні канчаткаў назоўнікаў: *твору* замест правільнага *твора, серыялу* замест *серыяла*. Вучні ў большасці пісьменныя, але памылкі, на жаль, былі, сярод якіх пераважалі арфаграфічныя (адсутнасць кропак у літары *ё*, напісанне літары *д* у слове *пацвярджаць,* выкарыстанне часціцы *не* замест правільнай *ні* ў складаназалежных сказах (*Якія б тэмы ні закранала, якія б праблемы ні ўздымала, яна гартуе і мацуе чалавека*) і інш.) і пунктуацыйныя памылкі (адасобленыя, пабочныя словы). Трэба адзначыць няправільнае ўвядзенне ў тэкст водгуку вершаваных радкоў іншых аўтараў: адсутнасць двукосся, калі падавалі ў радок, і наяўнасць, калі падавалі ў слупок.

Такім чынам, ацэньваючы водгукі па такіх крытэрыях, як уменне выяўляць асноўную тэматыку і праблематыку, ідэю твора, уменне абгрунтаваць прачытанае, вызначаць ролю сюжэта, кампазіцыі, можна з упэўненацю адзначыць, што ўдзельнікі алімпіяды валодаюць гэтымі навыкамі, аднак неабходна больш увагі надаваць рабоце з моўным і кампазіцыйным афармленнем водгуку пры арганізацыі падрыхтоўкі вучняў для абласной і рэспубліканскай алімпіяд.